# *§ 18–0. Ад беларускай народнасці да беларускай нацыі

НАРОДНАСЦЬ
«ГОМАН»
БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА
НАЦЫЯНАЛЬНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ
«ТУТЭЙШЫЯ» ЭТНАС
ЗАХОДНЕРУСІЗМ

**1. Паняцце «нацыя».** Са станаўленнем індустрыяльнага грамадства звязанае фарміраванне **нацый**. Рост прамысловай вытворчасці, урбанізацыя, інтэнсіўнае развіццё сродкаў камунікацыі, транспарту, гандлю спрыялі стварэнню агульнасці эканамічнага жыцця, фарміраванню адзінай эканамічнай прасторы, нацыянальнай самасвядомасці — найважнейшых нацыянальных прыкмет.

ПРЫКМЕТЫ НАЦЫІ




Успомніце, якая форма этнічнай супольнасці склалася на тэрыторыі Беларусі ў XVI ст.

**Нацыя** — устойлівая супольнасць людзей, якая гістарычна склалася на аснове адзінства мовы, тэрыторыі, эканамічнага жыцця, нацыянальнага характару, самасвядомасці і культуры.

Як вы лічыце, якую ролю ў фарміраванні нацыі адыгрывае гістарычная памяць? Сваю думку аргументуйце.

Успомніце, якія былі гістарычныя ўмовы фарміравання беларускай нацыі.

Знайдзіце на картасхеме (форзац 1) тэрыторыю пражывання беларусаў у XIX — пачатку XX ст. Параўнайце з сучаснымі межамі Рэспублікі Беларусь. Зрабіце вывад.

**2. Умовы фарміравання беларускай нацыі.** Беларускі этнас у перыяд апошніх дзесяцігоддзяў XIX — пачатку XX ст. выйшаў на стадыю фарміравання сучаснай нацыі.

Фарміраванне беларускай нацыі адбывалася ў межах Расійскай імперыі. Асноўную тэрыторыю пражывання беларусаў у XIX — пачатку XX ст. складалі пяць губерняў — Віленская, Віцебская, Гродзенская, Мінская і Магілёўская.

**Палітыка расійскага ўрада**

Пасля задушэння паўстання 1863 г. асновай палітыкі расійскага ўрада былі пашырэнне рускага землеўладання, запрашэнне на службу ў беларускія губерні чыноўнікаў з цэнтральных раёнаў Расійскай імперыі. Спрыяльным сацыяльным асяроддзем для правядзення ўрадавых мерапрыемстваў лічылася шматлікае беларускае праваслаўнае сялянства.

Школа цалкам была пераведзена на рускую мову навучання, пашырана выкладанне расійскай гісторыі і культуры; рабіліся спробы папулярызацыі і актыўнага ўцягвання настаўнікаў у вывучэнне мясцовай гісторыі і традыцый.

Як вы лічыце, чаму беларуская буржуазія не адыгрывала істотнай ролі ў эканамічнай і культурнай галінах грамадскага жыцця?

Расійскі ўрад увёў абмежавальныя мерапрыемствы ў дачыненні да «асоб польскага паходжання» (палякаў, каталікоў), што жылі на тэрыторыі Беларусі. Мерапрыемствы датычыліся іх культурнага, канфесійнага і эканамічнага жыцця. Прадстаўнікі мясцовых паланізаваных эліт не бачылі ў беларусах асобнага народа, не прызнавалі за імі права на этнічную самабытнасць.

**Роля буржуазіі ў фарміраванні беларускай нацыі**

Станаўленне капіталістычнага грамадства ў Беларусі аказала важны ўплыў на фарміраванне беларускай нацыі. Нягледзячы на тое што асноўныя капіталы знаходзіліся ў руках польскіх і рускіх памешчыкаў, яўрэйскіх купцоў і прамыслоўцаў, зараджалася беларуская нацыянальная буржуазія. Яна ўяўляла сабой праслойку мясцовай шматнацыянальнай эканамічнай эліты. Разам з тым бела-

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**М. Каяловіч. «Чытанні па гісторыі Заходняй Расіі». 1884 г.**

Як дваццаць гадоў таму, так і цяпер, паўстае пільная патрэба ведаць заходнюю Расію па-руску, разумець па-руску... і ўводзіць у гэтае веданне і разуменне мільёны новых нашых грамадзян заходняй Расіі, простых маларосаў, беларусаў і літвінаў, якія больш і больш уступаюць пасля вызвалення сялян у вобласць ведаў і памкненняў адукаваных людзей.

1. *Як называлася сістэма поглядаў, прыхільнікі якой лічылі беларусаў часткаю трыадзінага (вялікарусы, беларусы, маларусы) тытульнага народа Расійскай імперыі?*
2. *Як вы лічыце, якія групы насельніцтва беларускіх губерняў у XIX ст. падзялялі погляды М. Каяловіча? Абгрунтуйце сваю думку.*



*Ілюстрацыя з альбома «Народы Расіі». 1877 г.*

руская эканамічная эліта была нешматлікая і слаба арганізаваная.

**3. Развіццё навуковых ведаў аб Беларусі і беларускім народзе.** Фарміраванне беларускай нацыі, зараджэнне беларускага нацыянальна-культурнага руху адбывалася на фоне спрэчак прадстаўнікоў эліт: *а хто такія беларусы?* Адказу на гэтае пытанне аб'ектыўна спрыялі сваімі працамі даследчыкі гісторыі, археалогіі, народнай культуры Беларусі. У XIX ст. адбываецца станаўленне славяназнаўства і **беларусазнаўства**.

У 1863 г. з ініцыятывы кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі на беларускай мове была выдадзена кніга «Рассказы на белорусском наречии». Яна прапаноўвала канцэпцыю гісторыі беларусаў як асобнага народа. У ёй знайшла абгрунтаванне думка, што беларус незалежна ад сваёй канфесійнай прыналежна-

### Пачатак станаўлення беларусазнаўства

**Беларусазнаўства** — гуманітарная дысцыпліна, аб'ектам вывучэння якой з'яўляецца Беларусь, яе гісторыя, традыцыі, культура, сацыяльнае жыццё і г. д.

сці застаецца беларусам, былі пералічаныя яго адрозненні ад паляка.

У ХІХ ст. планамерна і комплексна вывучаліся беларуская гісторыя і культура. Вучоныя зрабілі важкі ўнёсак у фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Вынікі даследаванняў, праведзеных у ХІХ ст., з'яўляюцца сёння нацыянальным здабыткам беларусаў.

## СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА

| Вучоны | Унёсак у развіццё беларусазнаўства |
|---|---|
| Зарыян Даленга-Хадакоўскі | Аўтар першай навуковай публікацыі, прысвечанай вывучэнню беларускай народнай культуры (1817 г.) |
| Канстанцін Калайдовіч | У артыкуле «Аб беларускай гаворцы» (1822 г.) падкрэсліў адрозненне беларускай мовы ад іншых славянскіх моў |
| Іван Грыгаровіч | Падрыхтаваў і апублікаваў першы зборнік дакументаў па гісторыі Беларусі — «Беларускі архіў старажытных грамат» (1824 г.). Аўтар-укладальнік 5-томнага выдання «Акты, якія адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі...» |
| Міхаіл Баброўскі | Прафесар Віленскага ўніверсітэта. Зрабіў дасяжнымі для даследчыкаў шэраг важных пісьмовых помнікаў, у тым ліку кнігі Ф. Скарыны |
| Яўстах і Канстанцін Тышкевічы | Заснавальнікі музейных калекцый беларускіх старажытнасцей у Лагойску (1842 г.) і Вільні (1856 г.) |
| Іван Насовіч | Аўтар-укладальнік першага фундаментальнага «Слоўніка беларускай гаворкі» (1870 г.) |
| Еўдакім Раманаў | Падрыхтаваў 15-томнае выданне «Беларускі зборнік», якое змяшчае надзвычай багаты матэрыял пра народную культуру беларусаў (1880-я гг.) |
| Яўхім Карскі | Аўтар фундаментальнага даследавання «Беларусы», у якім навукова абгрунтаваў наяўнасць этнічнай самасвядомасці беларусаў |
| Аляксей Сапуноў | У 1913 г. у Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута пачаў чытаць курс лекцый па гісторыі Беларусі |
| Адам Багдановіч | Бацька Максіма Багдановіча, выдаў этнаграфічны нарыс «Перажыткі старажытнага светапогляду ў беларусаў» (1895 г.) |
| Вацлаў Ластоўскі | Выдаў першы абагульняльны нарыс «Кароткая гісторыя Беларусі», дзе даў арыгінальнае канцэптуальнае асэнсаванне нацыянальнай гісторыі (1910 г.) |

**ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ**

*З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі:*
1. *Падрыхтуйце паведамленне аб дзейнасці Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў.*
2. *Вызначце адрозненні правядзення археалагічных раскопак у XIX ст. і сучаснымі археолагамі.*

**4. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці.** У канцы XIX — пачатку XX ст. тэрмін «Беларусь», этнонім «беларусы» замацаваліся за ўсёй этнічнай тэрыторыяй беларусаў і паступова выцяснялі іншыя агульныя для Беларусі назвы. Аднак яшчэ працяглы час разам з саманазвай «беларусы» выкарыстоўваліся варыянты канфесійнай ідэнтыфікацыі (праваслаўныя і каталікі), а частка насельніцтва Беларусі называла сябе «тутэйшымі». Часцяком ужываўся тэрмін «ліцвіны», асабліва ў заходніх раёнах Беларусі. Мелі пашырэнне таксама рэгіянальныя варыянты саманазваў — напрыклад, «палешукі» для жыхароў усяго Палесся, «пінчукі», «берасцейцы» — для асобных яго частак.

Адбыліся істотныя змены ў этнічнай самаідэнтыфікацыі беларусаў. Сярод сялян і пралетарыяту пераважалі прадстаўнікі карэннага этнасу. Сярод патомнага дваранства 51,8 % прызнавалі сябе беларусамі. Адной з рыс фарміравання беларускай нацыі было тое, што больш за 90 % яе прадстаўнікоў жыло ў сельскай мясцовасці.

**Беларусы — шлях да агульнай саманазвы**

**Нацыянальная самасвядомасць** — сукупнасць ідэй, уяўленняў, перакананняў, вераванняў, у якіх народ усведамляе сябе як нацыю.

**5. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі.** **Нацыянальная ідэя** — гэта адказ на пытанні: адкуль мы? хто мы? куды ідзём? У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. беларуская інтэлігенцыя была занятая выпрацоўкай ідэйнай асновы развіцця нацыянальна-культурнага руху. Дзеячы беларускага нацыянальнага руху абгрунтоўвалі правы беларускага народа на развіццё роднай мовы, культуры,

**Нацыянальная ідэя** — сукупнасць уяўленняў і поглядаў аб жыццёва важных інтарэсах сацыяльна-этнічнай супольнасці.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



Карціну «Беларус» напісаў Ільля Рэпін у 1882 г. у сваёй сядзібе Здраўнёва, што знаходзіцца недалёка ад Віцебска. Гэта партрэт мясцовага селяніна Сідара Шаўрова, нашчадкі якога і сёння жывуць у Беларусі. У 1988 г. у былой сядзібе мастака быў адкрыты музей.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся біяграфію Сідара Шаўрова і гісторыю яго знаёмства з Ільём Рэпіным.*
2. *Якія рысы селяніна-беларуса паказаў мастак у сваёй карціне?*

патрабавалі адраджэння іх высокага статусу, прызнання права беларускага народа на сваю дзяржаўнасць.

Важным этапам у фарміраванні беларускай нацыянальнай ідэі было паражэнне паўстання 1863–1864 гг. Былі зроблены захады па дэпаланізацыі тэрыторыі Беларусі, па адмове ад адраджэння традыцый Рэчы Паспалітай, пачаліся актыўныя этнаграфічныя, гістарычныя, філалагічныя даследаванні нашых зямель. Класік заходнерускай гістарыяграфіі М. Каяловіч у сваіх работах паказаў Беларусь як зямлю, прыгнечаную палякамі; ён таксама першы стварыў канцэпцыю тэрыторыі Беларусі як «там, дзе ёсць беларуская мова».

**Роля суполкі «Гоман» у фарміраванні беларускай нацыянальнай ідэі**

Значны ўнёсак у фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі зрабілі ўраджэнцы Беларусі, сябры суполкі «Гоман» Х. Ратнер і А. Марчанка. На старонках аднайменнага часопіса, два нумары якога былі выдадзены ў Пецярбурзе, яны абгрун-

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

«Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак…»

*Ф. Багушэвіч*






Год 1. Вильни 24 жнiўня 1906 г. № 1.

Гоман

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ

«Мы — беларусы і павінны змагацца за мясцовыя інтарэсы беларускага народу і фэдэратыўную аўтаномію краю».

*«Гоман», 1884 г.*

*Пра якія жыццёва важныя інтарэсы беларускага народа гаворыцца ў прыведзеных цытатах?*

тавалі права беларускага народа на нацыянальную дзяржаўнасць у выглядзе федэрацыі з Расіяй. Задачай беларускай інтэлігенцыі яны лічылі абуджэнне этнічнай самасвядомасці, нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне народа.

Ідэі суполкі «Гоман» аказалі ўплыў на беларускі нацыянальны рух. Палітычная праграма БСГ паўтарала асноўныя палажэнні праграмы «Гоман»: самабытнасць беларускай нацыі і федэрацыя з Расіяй.

**Развіццё беларускай нацыянальнай ідэі**

Вялікі ўнёсак у развіццё беларускай нацыянальнай ідэі зрабілі Я. Карскі (аўтар трохтомнага этнаграфічнага даследавання «Беларусы»), Ф. Багушэвіч (аўтар зборніка вершаў на беларускай мове «Дудка беларуская»).

Напачатку XX ст. БСГ і створаныя з ініцыятывы яе лідараў культурна-асветніцкія арганізацыі (рэдакцыя газеты «Наша ніва», выдавецкае таварыства «Наша хата» і інш.) зрабіліся цэнтрам

выпрацоўкі і папулярызацыі ідэалогіі беларускага нацыянальнага руху.

Істотным вынікам нацыянальнага будаўніцтва ў Беларусі было стварэнне ў 1919 г. БССР. Існаванне БССР падрыхтавала ўмовы для афармлення сучаснай беларускай нацыі і незалежнай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь. Сёння беларусы незалежна ад веравызнання і этнічнай прыналежнасці складаюць адзіны беларускі народ. Нас аб'ядноўваюць агульныя традыцыйныя маральныя каштоўнасці, любоў да сваёй краіны, узаемапавага і ўзаемадапамога.

*Напачатку XX ст. паводле ўзроўню этнічнай кансалідацыі, развіцця самасвядомасці і нацыянальна-культурнага руху, ва ўмовах фарміравання ў Беларусі адзінага эканамічнага рэгіёна беларускі народ выйшаў на якасна новы ўзровень свайго этнічнага развіцця. Беларусы сталі на шлях станаўлення нацыі. Беларуская інтэлігенцыя абгрунтавала самабытнасць беларускага народа і яго права на стварэнне ўласнай дзяржаўнасці.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
|---|---|
| 1915 г. — пачатак выдання часопіса «Новая моладзь» у Шанхаі | 1913 г. — пачала выходзіць беларускамоўная штотыднёвая газета «Беларус» |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Дайце вызначэнне паняццю «нацыя». Запоўніце табліцу, адлюстраваўшы ў ёй прыкметы беларускай нацыі, фактары, якія станоўча і адмоўна ўплывалі на іх фарміраванне.
2. Які ўнёсак у развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў зрабілі вучоныя, што заклалі асновы беларусазнаўства? Свой адказ пацвердзіце прыкладамі.
3. Якія саманазвы беларусаў вы сустракалі ў мастацкай літаратуры, навукова-папулярных публікацыях, прысвечаных розным гістарычным перыядам?
4. У чым, на вашу думку, заключалася беларуская нацыянальная ідэя ў канцы XIX — пачатку XX ст.? Ці актуальная яна сёння?
5. Як бы вы адказалі на пытанні: хто мы? Адкуль мы? Куды ідзём?